№ 2(144). Вільня, 25 Студзеня 1939 г. Год XI.

Шлях Моладзі

Šlach Moładzi

ІЛЮСТРАВАНЫ ЧАСАПІС БЕЛАРУСКАЙ МОЛАДЗІ

ПРАЗ КНІЖКУ ДА СЬВЯТЛА І ДАБРАБЫТУ

Нядаўна прэса падала наступную вестку: Згодна з данымі Галоўнага Статыстычнага Ураду ў Польскай Рэспубліцы ёсьць 34.480 бібліятэкаў з 15 мільёнамі 800 тысячамі тамоў. З гэтага ліку прыпадае на публічныя бібліятэкі 26,9 працэнтаў (38,1 прац. тамоў), на бібліятэкі пачаткавых школаў 66 прац. (38,1 прац. тамоў), на бібліятэкі сярэдніх школаў 3,9 прац. (15,4 прац. тамоў), вучыцельскіх школаў 1 прац. (4 прац. тамоў), высокіх школаў 0,06 прац. (17,4 прац. тамоў), на вайсковыя бібліятэкі 0,04 прац. (1,4 прац. тамоў) і ў канцы на вастрожныя бібліятэкі 0,4 прац. (0,6 працэнтаў тамоў)

На першы пагляд лік 34,480 бібліятэкаў выглядае даволі вялікім. Тымчасам калі прыглядзімся да сапраўднага стану распаўсюджаньня кніжак і бібліятэкаў у нашым краю на вёсцы, дык пабачым, што іх там надта мала, бо знаходзяцца яны пераважна у местах. А калі дзе і ёсьць на вёсцы бібліятэкі, дык яны вельмі скромныя і складаюцца ў большасьці з кніжак польскіх і расейскіх, не заўсёды даступных для нашага вясковага чытача. Праўда, многа беларускіх бібліятэкаў і то бібліятэкаў багатых і цэнных, якія былі пры гуртках розных беларускіх арганізацыяў, зьлівідавана адначасна з гэнымі арганізацыямі. Гэта, ясна, не паправіла палажэньня. Факт-жа, што кніжка ў нас мала распаўсюджаная, астаецца далей фактам, якім хваліцца ня прыходзіцца. Бо кніжка, колькасьць яе распаўсюджаньня, а так-жа колькасьць бібліятэкаў ёсьць меркай і доказам вышыні культуры народу і разьвіцьця ягонага. Добрая бібліятэка, збор рознаякіх скамплектаваных кніжак ёсьць, можна сказаць, быццам крыніцай усебаковай веды, каторую могуць чэрпаць усе, хто толькі мае да гэтага ахвоту.

Характар бібліятэкаў, як відаць нават і з вышэй прыточанае зацемкі, бывае рознаякі. Ёсьць бібліятэкі школьныя, папулярныя, фаховыя, ёсьць бібліятэкі грамадзкія, дзяржаўныя і прыватныя. Для нас Беларусаў, асабліва сялянскае моладзі, найбольш патрэбныя бібліятэкі характару грамадзкага з кніжкамі папулярна-навуковымі і з цікавай прыгожай бэлетрыстыкай (апавяданьнямі, расказамі, рамансамі). Апрача таго, характар бібліятэкі павінен вызначацца беларускасьцю. Гэта значыць, трэба старацца, каб у нашых бібліятэках было як найбольш беларускіх кніжак. Праз такую бібліятэку чытач можа ўсяго навучыцца. Можа і павінен пазнаць сваю старонку, ейную мінуўшчыну, яе прастор, насельніцтва, слаўных змагароў, шляхі, якімі людзі хадзілі, як разьвівалі і разьвіваюць сваё жыцьцё. Праз бібліятэку чытач можа і павінен знайсьціся ў сувязях з шырокім сьветам, каб лепш мог зразумець сваё палажэньне і палепшаць сваё жыцьцё.

Пры бібліятэках трэба старацца закладаць так-жа чытальні і арганізаваць пры іх гутаркі, у часе каторых можна было-б абменьвацца думкамі, расказваць адны другім аб прачытаных кніжках і г. д.

Гаворачы аб беларускіх грамадзкіх бібліятэках, трэба сказаць, што абставіны сучаснага нашага жыцьця вельмі няспрыяючыя для гэтае справы. Аднак-жа ёсьць некаторыя магчымасьці, якія пры добрай волі можна выкарыстываць дзеля пашырэньня беларускіх кніжак. Вось-жа паўстаюць цяпер у нашым краю бібліятэкі валасныя, закладаюць часта бібліятэкі Ахвотніцкія Пажарныя Стражы, коопэратывы, вучыцялі, розныя польскія арганізацыі, а так-жа можна закладаць і прыватныя бібліятэкі. Дзеля таго мясцовыя жыхары павінны ўсімі сіламі старацца, каб у кожнай грамадзкай бібліятэцы абавязкава знайшліся беларускія кніжкі, перад усім-жа мусяць яны быць у валасных бібліятэках, каторыя закладаюцца коштам усіх грамадзян тае ці іншае воласьці.

Урэшце справа прыватных беларускіх бібліятэкаў. Іх можна закладаць бяз ніякіх фармальнасьцяў, але каб залажыць бібліятэку, сабраць хоць невялікі камплект кніжак, трэба грошаў і то нямала, а ў нас бадай усюды галіта. Тут выхадам будзе модная цяпер складка. Трэба, каб некалькі чалавек сабраліся, згаварыліся і куплялі кніжкі ў складчыну, карысталі з іх самі і другім пазычалі. Фактычна ў нас у гэтым ужо зроблены вельмі добры пачатак. На вёсцы некаторыя з беларускіх інтэлігентаў маюць свае прыватныя бібліятэкі, каторыя спаўняюць вялікую культурную работу. Прыгожы гэты пачатак мусім як найшырэй разьвіваць, памятуючы, што праз кніжку і бібліятэку ідзём да сьвятла і дабрабыту!..

Я. Н.

Расея і „Русския"

Увага цэлай Эўропы цяпер сьціроўваецца і на ўсход, у бок СССР — Расеі. Гэта паказвае, што надыходзіць пара барацьбы за ўплывы ў гэтай шостай часьці сьвету. Няма сумніву, што гэтая барацьба ў першую чаргу пачнецца на абшарах Беларусі і Украіны. Камуністы даўно прадбачылі гэтую вялікую і рашучую барацьбу, якая дасьпявае ўжо некалькі дзесяткаў гадоў і дзеля гэтага сьпяваючы „Это будет последний и решительный бой", што ў інтэрнацыянале адносіцца да сусьветнай рэвалюцыі, у СССР датасавалі гэную думку да расейскага патрыятызму і „Русскага" народу.

Зазначаем, што мы прызнаём і шануем Расейскі (Вялікарускі) народ, які мае сваю мову, культуру, багатую літаратуру і гісторыю, але на ягоных этнографічных землях. Гэта значыць прызнаём гэты народ паводле разуменьня заходне-эўрапэйскага. Заўсёды-ж будзем змагацца з расейскім вялікадзяржаўніцкім наступам, каторы хоча праглынуць Беларусаў і на якім апіраюць свой сьветапагляд і цяперашнія маскоўска-бальшавіцкія валадары. Бо-ж палітыка гэтых валадароў ідзе ў кірунку паступовага нішчэньня беларускага адраджэнскага руху і апошнім часам дайшло ўжо да таго, што весткі аб якой-небудзь пазытыўнай беларускай культурнай працы ў Беларускай Савецкай Рэспублікі зьяўляюцца рэдкасьцю. У СССР, як за „цара бацюшкі", ідзе да таго, каб інтарэсы ўсіх народаў Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублікаў падпарадкаваць інтарэсам „Русского Народа".

Расейскі імпэрыялізм зрадзіўся ў працягу некалькіх стагодзьдзяў. Паўстаў ён і разьвіўся пад клічамі „собирания русских земель", „освобождения славян", „защиты православия", „усмирения инородцев" і г. д. Амаль пяцьсот гадоў Маскоўшчына вяла пад гэнымі клічамі сваю мілітарную экспансію ўва ўсе бакі ад свайго этнографічнага аселішча і гэта аформіла паняцьце Рускага народу зусім ня так, як аформілася паняцьце аб народзе (нацыі) сярод заходне-эўрапэйскіх народаў. Дзеля гэтага Расейцы раўняючы сябе з іншымі народамі сьвету зусім і самі не разумеюць сябе. Гэта ярка выяўляе адзін рускі паэт такімі славамі:

„Умом России не обнять...
„В Россию можно только верить.

Заваяваныя землі ня былі для Расеі тым, чым былі для заходне-эўрапэйскіх дзяржаваў заморскія калёніі. Для Расеі заваяваныя землі станавілі базу далейшага заваяваньня. Дзеля таго Расейцы ня толькі што не давалі разьвіваць заваяваным народам сваей народнай культуры, але наадварот—нішчылі яе. Яны прадалі Аляску, калі ўсьведамілі, што адтуль няма куды пашыраць сваей мілітарнай экспансіі, а за бязвартасныя закаспійскія сьцяпы заўзята змагаліся, каб адтуль мець магчымасьць мілітарна гразіць суседзям і спыняць уплывы эўрапэйскіх дзяржаваў.

Ад Івана Каліты аж да сучаснасьці Расейцы, з прычыны беспрарыўнай мілітарнай экспансіі і заваёўваньня ўсё новых зямель, *не змаглі вырабіць у сабе пачуцьця сваіх этнографічных граніцаў сваей бацькаўшчыны.* Іхняе „отечество" ўсьцяж расшыралася і было для іх усюды там, дзе ступіў нагой рускі салдат.

Англія, Францыя, Нямеччына і іншыя дзяржавы мелі бацькаўшчыну-мэтраполію і мелі калёніі, як нешта дадатковае да бацькаўшчыны. У псыхіцы Расейцаў такога паняцьця, такога падзелу на блізкае й далёкае няма. Расшыранае паняцьце бацькаўшчыны на ўсе чужыя, заваяваныя землі зусім пакрываецца з цяперашнім інтэрнацыяналізмам у СССР. Калі заклікае Сталін, або іншыя палітыкі СССР да выяўляньня патрыятызму і да любові „отечества", дык гэта зусім ня ёсьць супярэчна ані з ідэяй камуністычнага інтэрнацыяналізму, ані з паняцьцем Расейцаў аб бацькаўшчыне, бо іхняе „отечество" ўсюды там, дзе стаіць савецкі чырвонаармеец.

Нацыянальнае пачуцьцё і нацыянальныя ідэалы Расейцаў нескрысталізаваны. У іх пачуцьцё бацькаўшчыны заступае пачуцьцё дзяржавы, а нацыянальнае пачуцьцё заступае дзяржаўны патрыятызм.

Дзеля гэтага Расейцы не маглі (многія і цяпер ня могуць) зразумець нацыянальнай асобнасьці іншых народаў, асабліва Беларусаў і Украінцаў.

Расейскія масы выгадаваны векавымі наступамі на суседзяў і перамогамі над імі; пры тым прывучаны да „пачытаньня" цароў і павадыроў, якіх навучаны ўважаць за нейкіх чарадзеяў. Гэта абясьсіліла ініцыятыву і самадзейнасьць рускай масы. Калі кола гісторыі пачало круціцца ў адваротны бок, — калі расейскаму цару пачала не ўдавацца мілітарная экспансія, — у масах згінуў міт царапачытаньня і яна жорстка памсьцілася за сваю веру ў яго на ім-жа самым. Але пасьля гэтага не праявіла ані сваей ініцыятывы, ані самадзейнасьці. Зненавідзеўшы цара, лёгка прыняла на яго месца камуністычную дыктатуру, зьмяшчаючы ўсе свае ідэалы ў асобе Леніна-Сталіна.

У такім псыхічным стане расейская маса знаходзіцца і цяпер. Нацыянальнай сьведамасьці, у нашым разуменьні, як ужо сказана, у расейскіх масах няма. Этнографічныя граніцы для іх ня існуюць. Паняцьце „отечества" і „русской власти" зьліліся туманна з інтэрнацыяналізмам і агулам бальшавізмам.

Тыпова расейскі імпэрыялізм з мэтамі асыміляцыйнымі далей трывае і ён можа найбольш прычыніцца да развальваньня СССР.

В. А—скі.

Да ўсіх супрацоўнікаў „Шляху Моладзі"

У месяцы лютым 1939 году мінае 10 год існаваньня і працы „Шляху Моладзі". Угодкі гэтыя рэдакцыя мае намер адзначыць пабольшаным выданьнем „Шляху Моладзі". Пабольшаны юбілейны нумар выйдзе 25 лютага, або 5-сакавіка. Пажадана было-б, каб у нумары гэтым знайшліся матарыялы як найбольшай колькасьці супрацоўнікаў „Шляху Моладзі." Дзеля таго загадзя ветліва просім усіх Паважаных Супрацоўнікаў „Шл. Моладзі" прыгатаваць і прыслаць адпаведныя матарыялы да 15 лютага 1939 г.

РЭДАКЦЫЯ

Ноч

Зьмярканьня шэраю дзяругай
пакрыты сонныя палі
і толькі вёска чорнай смугай
як-бы маячыцца ў далі...

Панура й сумна, быў пустыні,—
кругом пануе ціхі змрок...
як пад заклятаю сьвятыняй,
павіс над Краем злы урок...

І толькі зоркі з зімнай ласкай
шапочуць нештачка ральлі...
О, ноч! калі-ж ты кончыш казку
людзкой нядолі на зямлі?

АЛЕСЬ МІЛЮЦЬ

Дзікева

Вецер—хлопец дурны і залётны—
затужыў над парканам сівым.
Дзень варожыць
быць сяньня пагодным,
вецер вучыцца быць маладым.

Вёска быццам ў зьнямозе прысела.
Па гумнох вераб'іны прывет.
Я хачу цябе сяньня, Дзікева,
кінуць вершам зьвінячым у сьвет.

Хоць ня маеш ніякае славы
ты, —
як тысячы вёсак другіх, —
толькі вецер, хлапчына курчавы,
любіць струны парканаў тваіх.

Пры балоце...
над рэчкай Бярэжай
расьцягнуліс твае хутары;
заблыталіся сьцежкі і межы,
быццам нейкі узор да гары.

Што Бярэжа?...
Балотная рэчка.
Летам куры брыдуць праз яе.
Яе бруднай вадзе на сустрэчу
толькі вецер шуміць па лазе.

Там — за рэчкаю —
сад нейкай пані,
а у садзе запушчаны двор,
ды цікавяць мяне тут сяляне
і спалоханых воч іх дакор.

Маладзіцы,
хлапцы і дзяўчаты,
і старыя дзядзькі,
і дзяды,
хто душу вашу сумам сасватаў,
хто зблытаў вашых дум пэвады?

Каля вас праз балоты дарога,
на дарозе людзкія сьляды...,
Вы-ж ня маеце страціць нічога,
апроч шэрай сялянскай бяды.

Дык нашто і спалох і трывога
у таёмных пацёмках начы.
Быццам спадкам нямая зьнямога
і жабрачча пакора душы.

Дзікева. 1.XII.38 г.

М. МАШАРА

Dzie-ž roŭnaść?...

Da 1938 h. z polskich arhanizacyjaŭ moładzi ŭ našym Krai najbolš byŭ viedamy i padtrymlivany h. zv. sanacyjnym abozam „Związek Młodej Wsi". Arhanizacyi hetaj u 1938 h. vialikuju kankurencyju pačaŭ rabić novasarhanizavany „ozonaŭski" „Związek Młodej Polski". Z hetaj pryčyny pavadyry abiedźviuch henych arhanizacyjaŭ starajucca adzin pierad druhim i pierad vysokimi ŭładami i pierad moładździu pakazać siabie ŭ jak najlepšym śviatle.

Voś-ža aficyjalny orhan centralnaha „Związku Młodej Wsi", časapis „Siew Młodej Wsi" ŭ № 3 z 15 I.39, u pieradavym artykule p. n. „Spokój na Kresach Wschodnich", miž inšym, hetak piša:

„U praciahu 20 hadoŭ svaje dziejnaści siarod maładoha sialanskaha pakaleńnia na ŭschodnich ziemlach Sajuz naš zdabyŭ praz ćviordyja došledy pracy mocnuju systemu ŭzhadavaŭčaje pracy i pavodle jaje navučaje šmatlikija rady sialanskaje moładzi: polskaje, biełaruskaje, litoŭskaje i ŭkrainskaje, jak katalickaje, tak pravasłaŭnaje i hreka-katalickaje. Asnovaj u pracy jość dumka: „volnyja z volnymi, roŭnyja z roŭnymi".

Vielmi pryhoža!.. Ale čamu heta likvidujucca tymi-ž centralnymi ŭładami „Związku Młodej Wsi" tyja hurtki hetaje arhanizacyi ŭ našym Krai, katoryja prabujuć pravodzić kulturnuju pracu pabiełarusku, abo ŭvodziać u biblijateki biełaruskija knižki?..

Kali „roŭnyja z roŭnymi", dyk čamu „Z.M.W." nia stavić kulturnaje biełaruskaje pracy na raŭnie z takoj-ža pracaj polskaj u našym Krai? Tymčasam, čamuści ab biełaruskaj kulturnaj pracy „ZMW" ničoha nia čuvać, choć siarod nasielnictva našaha Kraju kulturnaja praca pabiełarusku pavinna być branaja najpierš pad uvahu, bo tolki biełaruskaja kulturnaja praca budzie naležna viaści naš Kraj da dabrybytu.

Nia hledziačy na ŭsio vyšej skazanaje, radzim tej biełaruskaj moładzi, jakaja jašče naležyć da „ZMW" słovy „Siewu Mł. Wsi" pryniać za dobruju manetu i zažadać, kab uva ŭsie biblijateki „ZMW" u našym Krai byli ŭviedzieny biełaruskija knižki, kab lekcyi, pradstaŭleńni ładzilisia pabiełarusku, kab kožny chor piajaŭ biełaruskija pieśni i h. d.

Moładź biełaruskaja, katoruju polskija arhanizacyi chočuć vykarystać dla svaich metaŭ, pavinna aryjentavacca ŭ pałažeńni i tak pastupać, kab raźvivałasia biełaruskaja kulturnaja praca, dy papraŭlaŭsia los miascovaha biełaruskaha nasielnictva.

j. n.

Вучні запісаныя Беларусамі

Паводле статыстыкі Міністэрства Асьветы Польскай Рэспублікі у 1936-37 школьным годзе ў сярэдніх школах было запісана роўна 720 вучняў, якія падалі беларускі язык, як свой родны. З гэтага:

у казённых школах было 602 ч.
у неказённых „ „ 118 „

З агульнай лічбы 720, у Беларускай Гімназіі (філіі) у Вільні было толькі 170 чал., а рэшта – 550 чал. — вучыліся ў школах польскіх:

у Навагрудзкім	в.	(186+22*=)	208
у Віленскім	„	(104+70=)	174
у Беластоцкім	„	(64+22=)	86
у Валынскім	„	(44+ 0=)	44
у Варшаўскім	„	(20+ 0=)	20
у Палескім	„	(7+ 1=)	8
у Люблінскім	„	(5+ 0=)	5
у Келецкім	„	(0+ 2=)	2
у Лодзкім	„	(1+ 0=)	1
у Пазнанскім	„	(0+ 1=)	1
у Львоўскім	„	(1+ 0=)	1**)

Гэта лічбы афіцыяльныя. З гэтай-жа статыстыкі даведваемся, што ў тым-жа часе ў чатырох ваяводзтвах — Навагрудзкім, Віленскім, Беластоцкім і Палескім — усіх вучняў у сярэдніх школах польскіх было 18.108, з якіх праваслаўных — 1.578. Разам з 153 праваслаўнымі вучнямі Віл. Беларускай Гімназіі (філіі) дасьць гэта лічбу 1.731.

Як бачым, Беларусамі не запісана нават палавіна праваслаўных, не гаворачы ўжо аб каталіках.

*) першая лічба ў дужках абазначае лік вучняў у школах казённых, а другая — у неказённых.

**) Паводле „Oświata i Wychowanie" за 1938 год, сшытак 7-мы, бач. 658 - 669.

Грамадзяне! Памятайце аб беларускай моладзі і прысылайце ахвяры на дапамаговы фонд беларускім незаможным а здольным вучням і студэнтам на адрыс: Red. „Šlachu Moładzi" — Wilno, Zavalnaja vul. 1—2.

Памятуйма, што свая беларуская інтэлігенцыя найлепш дбае аб дабро для свайго Беларускага Народу!

Jak paŭstaŭ hramafon?

Siarod Biełarusaŭ na vioscy hramafon dasiul byŭ redkaściu, bolš zatoje pašyrany jon u miestach, asabliva siarod zamažniejšych miaščan. Apošnimi adnak hadami zacikaŭleńnie hramafonam vielmi ŭzrasło. Pryčynilisia da hetaha ŭ pieršuju čarhu pryhožyja plitki z biełaruskimi pieśniami ŭ vysaka-mastackim vykanańni słaŭnaha biełaruskaha śpievaka Michała Zabejdy-Sumickaha. Biełaruskija plitki ściahvajuć da hramafonu — hetaje „cudoŭnaje“ mašynki — masu ludziej, katoryja časta ŭ składčvnu kuplajuć sabie nia tolki plitki, ale hramafony i padobnyja da ich patefony.

Adnačasna cikava, jak-ža-ž paŭstała henaja „cudoŭnaja“ mašynka, katoraja pieradaje i miłyja tony našych biełaruskich pieśniaŭ?

Hramafon faktyčna nia jość najnaviejšym vynachodam. Jon užo dobrych paru dziesiatkaŭ hadoŭ słužyć ludziam. Vynajšoŭ jaho vialiki amerykanski vynachodčyk Edison, jaki pamior niekalki hod tamu.

Edison, pryjmajučy za asnovu, što kali my havorym dyk adnačasna paŭstaje ruch faloŭ u pavietry, pastanaviŭ pieraniaści i ŭtryvalić hetaje falavańnie na metalovyja plitki, kab paśla adpapiednym štyftam, ihołkaj, vyklikać ich paŭtorna. Dumku stvaryć mašynu, jakaja zamacoŭvała-b ci lepš skazać utryvalivała-b čałaviečuju movu, Edisonu chutka ŭdałosia ździejśnić. Peŭnie pieršy hramafon nie vyhladaŭ hetak, jak ciapierašnija hramafony, ale asnova ich astałasia edisonaŭskaja.

Hramafonaja plitka, jakaja raźviesialaje pryhožaj pieśniaj ci muzykaj, paŭstaje ŭ specyjalnych fabrykach pry častych probach i miarkavańniach.

Naihryvajuć plitki spačatku na vaskovaj masie, z jakoj robiacca paśla metalovyja adlivy. Kali metalovaja forma jość, adbitki, ci faktyčnyja hramafonnyja plitki paŭstajuć chutka. Adzin rabotnik u praciahu hadziny moža adbić kala 60 plitkaŭ. Samyja plitki robiacca z masy, u skład jakoje uvachodziać: talka, žyvica, ziamny vosk i vałakno. Na plitcy bačym my kruhi, z utryvalenymi hukami, i hetyja huki pry pomačy membrany i specyjalnaje ihołki možam mnohija razy paŭtarać — słuchać.

Utryvalivajucca, naihryvajucca na plitkach huki, padobna jak i vyklikajucca, — taksama adpaviednym štyftam — ihołkaj.

Z. B.

Арабская прыповесьць

(Із Змофскага)

Нясьмела, з пашанаю, да Магамэта
прыйшоў маладзён ды гавора ён гэтак:
—„Бацькі мае зьмерлі і спадку ня маю,
цяпер ад Прарока я ведаць жадаю,
ці ёсьць у мяне абавязкі да іх?“
І кажа Прарок: — „Ёсьць, чатыры усіх:
За бацькавы душы маліцца да Бога,
сплаціць іх даўгі, не ўтаіўшы нічога,
у памяці мець, што бацькі шанавалі,
шчадзіць-жа усё, што яны зʼбудавалі.“

ЎЛАД-ІНІЦКІ

Выбары ў самаўрад і маладое беларускае пакаленьне

(Голас з вёскі)

Фармальна ў выбарах у самаўрад можа прыймаць удзел толькі тая моладзь, каторая мае ўжо скончаных 24 гады, але выбарнай акцыяй, г. зн. памагаць у праводжаньні выбараў добрай радай, могуць займацца і малодшыя. Гэтак фактычна і было ў некаторых мясцох. І там, дзе памагала моладзь, там пераважна ў нашым краі выбіранымі былі ў рады Беларусы.

18.XII.38 г. адбыліся выбары ў вясковыя грамадзкія рады на абшары Нясьвіжскага пав. Галасаваньне мала дзе адбывалася, бо пераважна было выстаўлена па адным сьпіску, які ўкладалі паны з ОЗН. Шырэйшыя-ж народныя кругі фактычна ня ведалі, як гэныя сьпіскі рабіць, ня знаючы новага выбарнага закону. Калі-ж дзе паўставаў другі сьпісак, дык ОЗН усімі спосабамі стараўся дабіцца з ім „абяднаньня,“ ці як у нас кажуць „паеднаньня,“ ідучы часта нават на вялікія ўступкі. Падобна было, між іншым, у нашай грамадзе — Вялікая Бухаўшчына, каля Клецку, Нясьвіжскага пав. У нас побач із сьпіскам „озонаўскім“ знайшоўся другі сьпісак сарганізаваны мясцовым маладым пакаленьнем. (Трэба сказаць, што шмат у гэтым памагла нам „Выбарная ардынацыя,“ каторую атрымалі мы ад „Шляху Моладзі“). Сьпісак гэты нарабіў шмат шуму і ў працягу некалькі дзён былі ўсьцяж робленыя стараньні „паеднаць“ яго з „озонаўскім“. І хоць тэрмін падачы сьпіскаў быў да 6.XII.38, аднак яшчэ 12.XII. былі спробы стварыць адну лісту. Паўнамоцнік беларускай лісты быў стойкім і не згадзіўся на ніякае „паеднаньне.“ Тады ўжо чакалі 18 сьнежня — дня выбараў і вынікаў галасаваньня.

Ня гледзячы на тое, што дзень 18 сьнежня быў марозным, аднак у выбарах прыймаў даволі вялікі працэнт насельніцтва. Галасаваньне адбывалася тайна, а вынікі яго аказаліся наступныя: першы „озонаўскі“ сьпісак атрымаў каля **190 галасоў і правёў 6 радных і 1 заступніка**, а другі сьпісак здабыў **540 галасоў і правёў 10 радных і 15 заступнікаў**. Пры тым трэба адзначыць, што на радных з першага сьпіску прыпадала па **27 галасоў**, а з другога сьпіску — па **91 галасоў**. З другога сьпіску прайшлі ў раду нашыя маладыя беларускія мясцовыя дзеячы: І. Мартышэнка, Цар і інш., пры помачы якіх наша вёска падала ўжо другі раз дэкларацыі на беларускую школу. З другога сьпіску прайшла ў раду адна беларуская дзяўчына.

Выбары ў Вялікай Бухаўшчыне ёсьць найлепшым прыкладам, што можна зрабіць пры добрай арганізацыі, стойкасьці і пры помачы маладога сьведамага беларускага пакаленьня.

Зусім іначай было ў суседняй мясцовасьці, у Малой Бухаўшчыне, дзе старыкі згадзіліся пайсьці на ўгоду з ОЗН і на 12 радных беларускіх сялян трапіла толькі 3 чалавек, а рэшта — г. зв. „шляхта,“ каторая што будзе хацець, тое будзе й рабіць.

Дзеля таго маладое беларускае пакаленьне, беларуская моладзь, павінна зварочваць вялікую ўвагу на самаўрадавыя выбары і памагаць сваім бацьком кіраваць так выбарнай акцыяй, каб як у грамадзкія, так у валасныя, а так-жа ў паветавыя рады праходзілі свае людзі — стойкія Беларусы, каторыя будуць належна кіраваць самаўрадам, бароняч інтарэсаў мясцовых сялян і заводзячы дабрабыт.

Бухаўскі